# ПАДПОЛЬНАЯ ГРУПА І. А. БЕКІШАВА



**І. А. Бекішаў, кіраўнік групы**

**Перыяд дзеяння:**

сакавік 1942 г. – лістапад 1943 г.

**Месца дзеяння:**

аэрадром г. Віцебска

**Колькасць:**

13 чалавек

**Кіраўнікі:**

Бекішаў Іван Андрэевіч

Дзейнічала з сакавіка 1942 г. да лістапада 1943 г. Кіраўнік І. А. Бекішаў («Андрэй») – былы начальнік Кастрычніцкага райжылкіраўніцтва ў Віцебску – у 1941 г. трапіў у акружэнне, зімой 1941–1942 гг. звязаўся з падпольшчыкам М. А. Шпакавым, вясной 1942 г. – з армейскай разведгрупай Ю. С. Рудакова («Жоржа», «Ягора»). Выконваючы іх заданні, прыцягваў да разведвальнай работы новых людзей. Летам 1942 г. Іван Андрэевіч наладзіў сувязь з В. Р. Кудзінавым – адказным арганізатарам Віцебскага падпольнага абкама КП(б)Б па г. Віцебску.

З красавіка 1943 г. група працавала пад кіраўніцтвам Віцебскага падпольнага гаркама КП(б)Б. У яе складзе было 13 чалавек: камуністы І. А. Бекішаў і Р. П. Канаплёў, камсамолкі В. І. Турок (Старавойтава) і А. Ільюшчанка, 9 беспартыйных патрыётаў.

На працягу амаль 2 гадоў група забяспечвала дакладнымі звесткамі пра аэрадром. Бекішаў працаваў там электраманцёрам, таму склаў падрабязны план аэрадрома, разам з братамі Васілём і Генадзем Арлоўскімі замініраваў 2 самалёты, з Р. П. Канаплёвым выявіў несапраўдны аэрадром, што дало магчымасць савецкай авіяцыі бамбіць рэальны.

Жонка Бекішава, вядомы ў горадзе ўрач Г. І. Багданава, прымала пацыентаў дома, тым самым забяспечвала сувязь паміж членамі групы, перасылала партызанам медыкаменты, ратавала моладзь ад угону ў Германію. Разам з медсястрой В. І. Турок кругласутачна назіралі за шашой Віцебск – Сураж. Падпольшчык М. А. Панкоў («Косця»), які быў умелым гравёрам, вырабляў розныя пячаткі і штампы. Група забяспечвала сябе і іншых патрыётаў узрыўчаткай і толам, працавала амаль без правалаў у цесным кантакце з існуючымі падпольнымі групамі. Адрас сястры Бекішава Ганны меўся ў Харужай, але Вера Захараўна яе не знайшла.

У лістападзе 1943 г. фашысты напалі на след кіраўніка групы, але яму ўдалося разам з сям’ёй апынуцца ў партызанскім атрадзе.

Іван Бекішаў узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны 1-й і 2-й ступеняў, Чырвонай Зоркі, 10 медалямі. Чатыры члены яго групы таксама маюць узнагароды.

**ЛІТАРАТУРА**

1. **Дарафеенка, Н. І.** Падпольная група Бекішава І. А. / Н. І. Дарафеенка, М. У. Дарафеенка // Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне, 1941–1945 : энцыклапедыя / рэдкал.: І. П. Шамякін (гал. рэд.). [і інш.] – Мінск, 1990. – С. 130.

2. **Дарафеенка, Н. І.** Падпольная група І. А. Бекішава / Н. І. Дарафеенка // Памяць: Віцебск : гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі : у 2 кн. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.] ; склад. А. І. Мацяюн ; маст. Э. Э. Жакевіч. – Мінск, 2002. – Кн. 1. – С. 480.

3. **Подпольная** группа Бекишева И. А. // Витебск : энцикл. справочник / редкол.: И. П. Шамякин (гл. ред.) [и др.]. – Минск, 1988. – С. 283–284.